ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 13 Нядзеля, 12 лістапада 1944 г.

Цяпер за Чырвонай Арміяй астаецца яе апошняя заключная місія: давяршыць разам з арміямі нашых саюзнікаў справу разгрому нямецка-фашысцкіх армій, дабіць фашысцкага звера ў яго ўласнай бярлозе і ўзняць над Берлінам сцяг перамогі. Ёсць падстава разлічваць, што гэтая задача будзе выканана Чырвонай Арміяй у недалёкім будучым.

І. В. СТАЛІН.

## МУДРЫЯ СЛОВЫ ПРАВАДЫРА ЗАКЛІКАЮЦЬ НАС НА НОВЫЯ ПОДВІГІ

З вялікім палітычным уздымам сустрэлі працоўныя нашага раёна даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны т. Сталіна.

Як толькі былі атрыманы цэнтральныя і рэспубліканскія газеты, даклад таварыша Сталіна быў прачытан на радзе прадпрыемстваў і ўстаноў. Вечарам 10 лістапада ў Косаве, Івацэвічах і другіх населеных пунктах адбыліся мітынгі прысвечаныя дакладу.

Даклад правадыра—дакумент вялікай гістарычнай важнасці. Простымі, для ўсіх зразумелымі, славамі т. Сталін паказаў увесь ход барацьбы Чырвонай Арміі і савецкага народа за чэсць і незалежнасць нашай радзімы з самага пачатку вайны.

—Гітлераўская Германія, вераломна напаўшая на нашу радзіму, адчула на сваіх плячах сілу сакрушальных удараў Чырвонай Арміі, эканамічную магутнасць нашага савецкага тыла.

Толькі на працягу лета 1944 г. па гітлераўскай ваеннай машыне было нанесена 10 сакрушальных удараў, у выніку якіх Германія страціла ўсіх сваіх васалаў, а ваенныя дзеянні былі перанесены на тэрыторыю фашысцкага звера. Савецкая зямля аказалася поўнасцю ачышчанай ад нямецкіх войск.

У выніку гэтых аперацый было разбіта і выведзена са строю да 120 дывізій немцаў і іх саюзнікаў.

,,Новым момантам за прайшоўшы год у вайне супроць гітлераўскай Германіі трэба лічыць той факт, што Чырвоная Армія вяла свае аперацыі ў гэтым годзе супроць нямецкіх войск не ў адзіноцтве, як гэта мела месца ў папярэднія годы, а сумесна з войскамі нашых саюзнікаў‘‘ (Сталін).

У выніку сумесных аперацый Чырвонай Арміі і армій нашых саюзнікаў Германія аказалася заціснутай паміж двума франтамі.

Таварыш Сталін даў высокую ацэнку рабоце нашага тыла, гераічным працоўным подвігам нашых рабочых, сялян і інтэлігенцыі, у выніку чаго была атрымана эканамічная перамога над ворагам.

,,Беспрыкладныя цяжкасці цяперашняй вайны не зламалі, а яшчэ больш загартавалі жалезную волю і магутны дух савецкага народа. Наш народ па праву заслужыў сабе славу гераічнага народа‘‘ (Сталін).

Даклад тав Сталіна прасякнут вялікай упэўненасцю ў нашай канчатковай перамозе. Ён заклікае нас на новыя гераічныя подвігі на фронце і ў тылу ва імя гэтай перамогі.

Даклад тав. Сталіна павінен стаць дастаяннем кожнага рабочага, селяніна, інтэлігента. Ён ідэйна ўзбройвае наш народ. Задача партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый давесці мудрыя словы правадыра да кожнай вёскі, да кожнага асобнага жыхара раёна. Мы павінны неадкладна арганізаваць гурткі па ўсіх прадпрыемствах, установах, у вёсках па вывучэнню гэтага гістарычнага дакумента.

Вывучаючы даклад правадыра кожны грамадзянін павінен моцна памятаць, што перад фронтам Чырвонай Арміі яшчэ стаіць 204 дывізіі немцаў і венграў, і што наша задача не паслабляць, а з кожным днём павялічваць дапамогу фронту ўсім неабходным.

,,Усё для фронта, усё для перамогі над ворагам!‘‘ — з гэтым баявым заклікам мы прыблізім радасны дзень канчатковага разгрома гітлераўскай Германіі.

## Працоўныя раёна вітаюць даклад правадыра

### Мітынг працоўных горада Косава, прысвечаны гістарычнаму дакладу т. Сталіна

Вечарам 10 лістапада адбыўся мітынг жыхараў гор. Косава, прысвечаны дакладу таварыша Сталіна, зробленага ім 6 лістапада на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета.

Пад бурныя апладысменты слова для зачыткі даклада прадастаўляецца заг. аддзела прапаганды і агітацыі РК КП(б)Б Остраухавай.

Тав. Остраухава чытае даклад правадыра. У зале ўстанавілася незвычайная цішыня. Кожны стараўся адчуць усім сэрцам веліч сталінскіх слоў.

Пасля зачыткі даклада пачаліся выступленні. Выступаючыя заклікалі працоўных горада аддаць усе сілы на выкананне ўказанняў тав. Сталіна, дадзеных у яго гістарычным дакладзе.

* * *

Мітынгі, прысвечаныя дакладу правадыра, адбыліся на ўсіх прадпрыемствах і ўстановах гарадскога пасёлка Івацэвічы, на станцыі Іванавічы і Косаў, а таксама ў радзе сельсоветаў раёна.

У адказ на гістарычныя словы т. Сталіна рабочыя прадпрыемстваў і чыгуначнікі ўзялі абавязацельствы павысіць прадукцыйнасць працы. Сяляне Альбінскага, Стайкаўскага, Бусяжскага і другіх сельсаветаў абавязуюцца яшчэ больш узмацніць дапамогу фронту, датэрмінова выканаць усе дзяржаўныя абавязацельствы.

Ал. Каліна.

# СВЯТКАВАННЕ 27-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

КОСАЎ. Ва ўрачыстай абстаноўцы адзначылі працоўныя горада Косава 27-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі.

Яшчэ з ранку 6 лістапада горад быў упрыгожан чырвонымі сцягамі, лозунгамі, устаўлен зялёнымі ёлкамі.

У 8 гадзін вечара 6 лістапада ў гарадскім клубе адбылося ўрачыстае паседжанне РК КП(б)Б і Райсовета дэпутатаў працоўных з удзелам прадстаўнікоў партыйных, совецкіх і комсамольскіх арганізацый, а таксама жыхараў горада і блізляжачых вёсак.

Даклад аб 27-й гадавіне Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі зрабіў сакратар РК КП(б)Б т. Кавалёў.

З вялікім палітычным уздымам прысутныя паслалі прывітальную тэлеграму Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза тав. Сталіну.

7 і 8 лістапада ў гарадскім клубе дэманстрыраваўся гістарычны кінофільм „Кутузаў“. На прагляд гэтага выдатнага кінофільма прыходзілі сяляне з навакольных вёсак.

ІВАЦЭВІЧЫ. Выкананнем узятых абавязацельстваў па звышпланавай здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі адзначылі працоўныя гарадскога пасёлка дні 27-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі.

Вечарам 6 лістапада адбылося ўрачыстае паседжанне Выканкома пасялковага совета, прысвечанае 27-й гадавіне Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі. Клуб быў перапоўнен.

Ва ўрачыстай абстаноўцы працоўныя пасёлка далі клятву яшчэ больш дапамагаць Чырвонай Арміі ў поўным разгроме нямецкіх захопнікаў.

Сіламі комсамольскай арганізацыі і моладзі ў пасялковым клубе былі наладжаны вечары мастацкай самадзейнасці. Пасля трох год чорнай нямецкай акупацыі працоўныя пасёлка радасна правялі вялікае свята.

* * *

Даклады аб 27-й гадавіне кастрычніка адбыліся па ўрачыстых паседжаннях у кожным сельсовеце. Працоўныя раёна прадэманстрыравалі сваю адданасць партыі Леніна-Сталіна, сваёй дарагой Радзіме, прадэманстрыравалі сваю гатоўнасць аддаць усе сілы на хутчэйшае знішчэнне цёмных сіл крывавага нямецкага фашызма.

# Клопатамі і ўвагай акружым сем'і воінаў Чырвонай Арміі

Аддзел дзяржаўнага забеспячэння праводзіць вялікую работу сярод насельніцтва па аказанню дапамогі сем'ям воінаў Чырвонай Арміі і чырвоных партызан.

Першымі на гэта мерапрыемства адклікнуліся сяляне Грыўдзенскага сельсовета. У добраахвотны фонд дапамогі сем'ям франтавікоў і партызан з гэтага сельсовета паступіла 1541 кілаграм зернавых і 3566 кг. бульбы.

Дабравольны фонд дапамогі сем'ям франтавікоў і партызан ствараецца і ў Альбінскім сельсовеце. Ужо паступіла 1018 кг. зернавых.

Мы павінны акружыць клопатамі і ўвагай сем'і нашых слаўных воінаў, каб яны, будучы на фронце, кожны дзень адчувалі, што ў тылу ў іх вялікая, дружная сям'я народаў Совецкага Саюза і што іх дзеці будуць забеспечаны ўсім неабходным.

Пачын сялян Грыўдзенскага і Альбінскага сельсоветаў павінны падхапіць усе сяляне раёна.

КРЫВАЛЬ, заг. аддзела дзяржаўнага забеспячэння Выканкома Косаўскага райсовета дэпутатаў працоўных.

# ВЯЛІКАЯ ЧЭСЦЬ

За датэрміновае выкананне ўзятых абавязацельстваў па звышпланавай здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі Стайкаўскі сельсовет занесен на раённую дошку пачота.

Для сялян нашага сельсовета гэта вялікая чэсць. Здаючы хлеб роднай Чырвонай Арміі кожны сялянін прасякнут свядомасцю, што ён уносіць уклад у агульную справу перамогі над ворагам.

З узятага абавязацельства ў 39300 кг. сяляне сельсовета здалі 42754 кг. Перадавыя сяляне, як Лобан Елена, Матусевіч Соня, Андрыяшка Варвара, Раўбэцкая Зіна, Міхнюк Андрэй, Жыгар Васіль і многія другія з'явіліся ініцыятарамі датэрміновай здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі.

Асаблівую актыўнасць у гэтай справе праявілі ўпаўнаважаныя сельсовета Радкевіч Ольга, Жыгар Марфа, Трэцяк Іван, Белая Надзя, Гаўрылік Марыя і другія.

Сваім асабістым прыкладам яны падымалі аднасяльчан на выкананне свайго патрыятычнага доўга перад Радзімай, перад Чырвонай Арміяй.

Дні 27-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі былі для ўсіх сялян вялікімі днямі. Амаль ва ўсіх вёсках сельсовета адбыліся ўрачыстыя вечары, прысвечаныя слаўнай гадавіне. Была атрымана тэлеграма з раёна, у якой райком партыі і Райсовет дэпутатаў працоўных віншавалі сялян сельсовета з дастойнай сустрэчай вялікага свята.

Натхнёныя герaічнымі подвігамі воінаў слаўнай Чырвонай Арміі сяляне Стайкаўскага сельсовета не пашкадуюць ні часу ні сіл для аказання яшчэ большай дапамогі Радзіме і фронту.

А. С. Кулецкі, старшыня Стайкаўскага сельсовета.

Рэдактар А. П. РУДОЙ.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 10б